**МІКО́ЛА**, свята ў гонар аднаго з самых шанаваных святых ва ўсходніх славян, у т.л. і беларусаў. Свяціцель Мікалай — архіепіскап Малайзійскага горада Міры Лікійскія (4 ст.). Мікалай Цудатворац — апякун пакрыўджаных і пакутнікаў, а таксама маракоў, падарожнікаў. Свята ў гонар М. адзначалі двойчы: вясновы, або летні (цёплы), М., які святкаваўся толькі праваслаўнымі 22 мая (н.ст.), і зімовы — адзначаўся праваслаўнымі і католікамі (6/19 снежня). М. зімовы выступае пачынальнікам сапраўднай зімы: «Да Міколы няма зімы ніколі». І Мікола зімовы, і Мікола летні як бы адкрывалі кожны свой сезон: «Мікола — сапраўдная зіма, Мікола — сапраўднае лета». Надвор'е, якое год на год не супадала, уносіла папраўкі ў нар. назіранні, і часам казалі: «Ніводнаму Міколе не вер ніколі». Затрымка зімы на М. была знакам, што маразы прыйдуць няскора і наогул уся зіма будзе «бяспутная». М. зімовы быў далучаны земляробам да будзённых гаспадарчых разлікаў і прагнозаў. «Беражы сена ад Міколы і да Міколы і не бойся зімы ніколі», — гарантавала прыказка, адзначаўшы прыблізна, колькі трэба трымаць у хляве жывёлу. Стан надвор'я ў гэты дзень арыентаваў селяніна на пачатак веснавой сяўбы, на плён у полі: «Калі іней будзе раней, чым 19 снежня, то трэба сеяць ранні ячмень, калі пазней 19 снежня — позні»; «Іней, які пакрывае дрэвы на Міколу, прадказвае добры ўраджай лёну».

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 446—450, 560—561; Тое ж. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 642.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ